ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

№ 24 (992) | ЧАЦЬВЕР, 30-га студзеня 1930 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Ліквідуем кулацтва, як клясу

У кастрычніку 1917 году пролетарская рэволюцыя ліквідавала палітычнае панства буржуазіі, падарвала яе экономічныя позіцыі, але не ліквідавала базы капіталізму, менавіта дробнай таварнай вытворчасьці. У выніку 12 год барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва мы дабіліся вялізарных посьпехаў у індустрыялізацыі краіны і пераводзе вёскі на рэйкі колектывізацыі. ГЭТЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ СТАЛІ АСНОВАЙ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ.

Другі конгрэс Комінтэрну ў рэволюцыі па аграрнаму пытаньню, заснаваны на тэзісах Леніна, даў такое азначэньне кулацтва:

„Буйным сялянствам зьўляюцца капіталістычныя прадпрыемцы ў земляробстве, якія гаспадараць па агульнаму правілу, з некалькімі наёмнымі рабочымі, зьвязанымі з „сялянствам“ толькі нявысокім культурным узроўнем, абіходам жыцьця, асабістай фізычнай работай у сваёй гаспадарцы. Гэта самы шматлікі з буржуазных пластоў, які зьяўляецца прамым і рашучым ворагам рэволюцыйнага пролетарыяту“. (Бела Кун „Комінтэрн у рэзолюцыях“, стар. 64).

Гэта эксплёататарская кляса, самы шматлікі атрад буржуазіі, абапіраючыся на сваю экономічную магутнасьць яшчэ ў часе рэволюцыі 1905 году ў Расеі вяла за сабою серадняком, а на Захадзе вядзе і зараз. Кулацтва карыстаецца самымі разнастайнымі формамі эксплёатацыі—ад прамой наёмнай працы да квотніцтніцтва ў грашовай і ў натуральнай формах. Пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі кулацтва было значна нашчыпана ў часе політыкі раскулачваньня. ЯГО МАГУТНАСЬЦЬ БЫЛА ПАДАРВАНА, АЛЕ БАЗА, З ЯКОЙ ЯНО РАСЛО, НЯ БЫЛА ЛІКВІДАВАНА.

Адказ на пытаньне, чаму мы ў першыя-ж гады пасьля перамогі Кастрычнікавай рэволюцыі ня ліквідавалі кулацтва, як клясу, дае таксама рэзолюцыя II конгрэсу Комінтэрну: „Аднак экспропрыяцыя нават буйных сялян не можа быць непасрэднай задачай перамогшага пролетарыяту, бо для абграмаджаньня такіх гаспадарак няма яшчэ ў наяўнасьці матар'яльных, у прыватнасьці, тэхнічных, а затым і соцыяльных умоў“ (там-жа).

Непасрэднай за ачай перамогшага пролетарыяту быў разгром старой дзяржаўнай машыны і пабудова новай. Экспропрыяцыя фабрык і заводаў, ліквідацыя фэодальна-нявольніцкага земляўласьніцтва і падаўленьне супраціўленьня каранной буржуазеі і адпор інтэрвэнцыі сусьветнай буржуазеі. Немагчымасьць прамога пераходу да соцыялізму і неабходнасьць згоды з асноўнай серадняцкай масай вёскі—прымусіла пролетарыят згадзіцца на дапушчэньне ў абмежаваных памерах капіталістычных адносін. Дапушчэньне абмежаваных вядомымі рамкамі капіталістычных адносін было толькі цярпімым злом, а гэта заключалася ў разьвіцьці соцыялістычна будаўніцтва, уздыме буйнай соцыялістычнай індустрыі, пераводзе дробнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці з капіталістычнага шляху разьвіцьця на рэйкі колектывізацыі, на шлях соцыялістычнай яе перабудовы. І у гэтым сэнсе—НЭП сабе апраўдаў

Буржуазія гораду і вёскі, якая выціскалася ўзмоцненым ростам соцыялістычнага будаўніцтва, вытворчым коопэраваньнем бядняцка-серадняцкіх мас — вырашыла даць бой. Шкодніцтва часьці буржуазных спэцыялістых, спробы зрыву хлебазагатовак у 1927-28 годзе, хваля кулацкага тэрору зьявіліся вынікам наступленьня пролетарыяту на капіталістычныя элемэнты. У выказанай пабочнай форме гэтая барацьба атрымала свой адбітак у атаках троцкізму і асабліва права-опортуністычнага ўхілу на партыю і яе лінію. Першы вынік, які ўжо яўна абазначыўся ў гэтай бойцы, гэта—пераход серадняцкіх мас да колектывізацыі. Гэта зьявілася ўдарам па экономічнай і ў вядомай ступені (стаўка на хістаньні серадняка) па політычнай базе кулацтва і ўсёй буржуазеі.

У СУЧАСНЫ МОМАНТ НАСЬПЕЛІ ТЫЯ МАТАР'ЯЛЬНА-ТЭХНІЧНЫЯ І СОЦЫЯЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ, ЯКІЯ АДСУТНІЧАЛІ Ў 1918 ГОДЗЕ. Тады раскулачваньне праходзіла пры нэйтралізацыі кулака, а зараз пры усё тым-жа кіраўніцтве пролетарыяту, РАСКУЛАЧВАНЬНЕ ПРАВОДЗІЦЦА БЕДНАТОЙ У САЮЗЕ З СЕРАДНЯЦКІМІ МАСАМІ, якія па новаму па соцыялістычнаму, організоўваюць гаспадарку.

ПОСЬПЕХІ Ў ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНІ, МАСАВАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЕДНАТЫ І СЕРАДНЯКОЎ СТВАРЫЛІ МАГЧЫМАСЬЦЬ ПАВАРОТУ АД ПОЛІТЫКІ АБМЕЖАВАНЬНЯ І ВЫЦЯСЬНЕНЬНЯ КУЛАЦТВА ДА ПОЛІТЫКІ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ.

ЧАС НЯ ЦЕРПІЦЬ!

ПАТРЭБЕН РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ

(Да месячніку лесазагатовак)

Абвешчаны месячнік па дрова-лесазагатоўках зьяўляецца вялізарнай політычнай работай, на выкананьне якой уся савецкая грамадзкасьць і ў першую чаргу комсамольскія організацыі павінны мобілізаваць сваю ўвагу і энэргію.

Дадзеныя Лесбелу аб выкананьні плянаў па лесазагатоўках гавораць нам аб тым, што справа ў гэтых адносінах абстаіць ня зусім добра. Па загатоўках лесаматар'ялаў мы маем усяго 45 проц. выкананьня гадовага пляну, а па дрэвах—40,4 проц. А калі ўзяць вываз, дык тут справа абстаіць ужо зусім дрэнна. Плян вывазу па лесаматар'ялах мы выканалі толькі на 3,5 проц., а па дрывах—ну 6,55 пр. Тут мы павінна дабіцца ў самы найбліжэйшы час рашучага пералому. Спасылкі на об'ектыўныя прычыны, на немагчымасьці і г. д. ня могуць нас задаволіць. Яны для некаторых бязьдзейнікаў служаць толькі шыльдаю, за якой хаваецца сапраўдны „абломаўскі“ твар гэтых „работнікаў“.

Абвешчаная Саветам Народных Камісараў БССР працгужпавіннасьць для кулацкіх гаспадарак павінна быць шырока скарыстана комсамольскімі організацыямі з тым, каб накіраваць увесь зьмест сваёй работы на яе выкананьне. Патрэбна пільна сачыць за ўсялякімі манэўрамі кулацтва, якое будзе імкнуцца адвярнуцца ад працгужпавіннасьці.

Побач з рашучым прымусам кулака да вывазу лесу комсамольскія організацыі павінны зараз-жа абгаварыць гэтае пытаньне ў ячэйках з тым, каб комсамольцы былі сапраўднымі застрэльшчыкамі па вывазу лесу Трэба організаваць комсамольскія абозы па вывазу лесу, ударныя брыгады з комсамольцаў. Патрэбна шырока мобілізаваць бядняцка-серадняцкія масы вёскі на выкананьне гэтых задач.

Факты, якія мы маем аб рабоце мобілізаваных комсамольцаў на лесазагатоўчы фронт яскрава сьведчаць аб тым, што ў гэтым напрамку маецца шэраг прарываў.

Камітэты комсамолу, АК, РК і ячэйкі павінны зараз жа ў асяролак свёй увагі паставіць задачу поўнага выкананьня плянаў лесазагатовак. Патрэбна, каб соцспаборніцтва стала магутнай зброяй па выкананьню ўсіх плянавых меркаваньняў. Зараз, як ніколі патрэбна ва ўсю шырыню паставіць пытаньне, што „няма ніводнага комсамольца ня ўдарніка“. Шырока разгарнуць ударніцкі рух, пакрыць лесазагатоўкі густой сеткай ударніцкіх брыгад. Патрэбна рашуча выкрываць бегультаў, дэзэртыраў, шкоднікаў, бюрократаў, якія перашкаджаюць рабоце па лесазагатоўках.

Камітэты комсамолу зараз-жа павінны вылучыць сталых працаўнікоў па дапамозе ячэйкам ЛКСМБ у лесазагатоўках. Патрэбна ўзмацніць жывое кіраўніцтва і дапамогу комсамольскім ячэйкам лесазагатоўчых вучасткаў.

Час ня церпіць! Комсамольскія камітэты і ячэйкі — дружна возьмемся за рашучы і энэргічны пералом у гэтай рабоце!

Фашысцкая дыктатура Польшчы перажывае глыбокі крызыс

„Рэволюцыйнасьць мас расьце і барацьба супроць фашызму ўзмацняецца. Барацьба гэтая спыніцца толькі тады, калі ў выніку ўзброенага паўстаньня будзе створан рабоча-сялянскі ўрад,—урад дыктатуры пролетарыяту“—галасна заявіў комдэпутат сойму тав. Росяк

ВАРШАВА, 28. На апошнім паседжаньні сойму комуністычная фракцыя ўнесла вотум недаверра ўраду Бартэля. З вялікай прамоваю, матывіруючай вотум недаверра, выступіў дэпутат Росяк. Росяк падкрэсьліў, што прамова Бартэля нічым не адрозьніваецца ад звычайных програмных выступленьняў ураду фактычнай дыктатуры.

У сучасны момант фашысцкая дыктатура перажывае глыбокі крызыс. Рэволюцыйнасьць мас расьце і барацьба супроць фашызму ўзмацняецца. Фашысцкі ўрад у барацьбе з нарастаючай рэволюцыйнай хваляй узмацняе тэрор у адносінах да рабоча-сялянскіх мас і нац. меншасьцяй. Ён напаўняе астрогі тысячамі рабочых і сялян і разам з міжнародным капіталам узмацняе падрыхтоўку вайны супроць Савецкага Саюзу. Адным з доказаў гэтай вайсковай падрыхтоўкі зьяўляецца знаходжаньне ў складзе ўраду Юзэфскага, былога міністра Пятлюры, вядомага падбухторшчыка вайны супроць СССР. (Моцны шум).

Дэпутат Росяк далей падкрэсьлівае, што фашысцкай дыктатуры няма звароту да ранейшага. Узброенае паўстаньне працоўных—вось адзіна-магчымы вынік гэтай дыктатуры. (Шум, крыкі).

Характэрызуючы далей растучы крызыс, Росяк зазначае, што крызыс ахапіў усе галіны прамысловасьці.

Барацьба фашысцкай дыктатуры з растучым рухам рабоча-сялянскіх мас, —працягвае Росяк,—пашыраецца і абвастраецца. Росяк пералічвае шэраг фактаў у тым ліку крывавую дэмонстрацыю 5-га сьнежня у Варшаве, дзе было кінута шмат бомбаў, у Пазнані, два беспрацоўных цяжка ранены, адзін памёр, зьбіеньне і арышт дэпутата Карузальскага, напад паліцыйскіх на дэпутата Сыпулу і Гавроня, страляніну баявой дружыны пэпээсаўцаў фракцыянэраў у дэпутата Жарскага, зачыненьне саюзу тэкстыльшчыкаў у Лодзі і г. д.

Але нягледзячы на гэта шырокія масы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ідуць разам з братэрскімі масамі СССР і, ня гледзячы на жорсткі тэрор уступаюць на рэволюцыйны шлях барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры. Барацьба гэтая спыніцца толькі тады, калі ў выніку ўзброенага паўстаньня будзе створан рабоча-сялянскі ўрад, урад дыктатуры пролетарыяту. (Шум, крыкі).

Вотум недаверра ўнесены комфракцыяй, быў адхілен пераважнай большасьцю галасоў. Супроць вотуму галасавалі таксама пэпээсаўцы.

Ленінскі заклік

Новыя ударныя брыгады і комуністычныя цэхі

(Менск, вагонныя майстэрні МББ)

Гэтымі днямі **пяцьдзесят пяць** *старых рабочых вагонных майстэрняў, маючых вялікі вытворчы стаж падалі заявы ў партыю.*

На **29-1**—*з пяцідзесяці пяці* **двадцаць пяць** *ужо зацьверджана ячэйкамі.*

Такарны цэх майстэрняў і тры підсобных—бандажны, кузьнечны і мэханічны абвясьцілі сябе **ударнымі, комуністычнымі цэхамі** *і пастанавілі цалком уступіць у партыю. Рабачыя пасажырскага цэху і двух падсобных пры ім—так сама пастанавілі абвясьціць свае цэхі—***ударнымі.**

Ня ўдарным на сёньня—застаўся толькі адзін **малярны цэх.**

З падаўшых заявы аб уступленьні ў партыю маюцца рабочыя з трыццаці сямілетнім вытворчым стажам (Шабан), 33-летнім (Аўсюкевіч), 39-летнім (Ашмянскі) і інш. Астатнія маюць вытворчы стаж 6—10—13—20 гадоў.

К.

У партыю Леніна



На здымку: Рабочыя комсамольцы Менскай шчотачнай фабрыкі, якія былі прыняты ў партыю ў дзень 6-годзьдзя з дню сьмерці Леніна.

Зьлева направа: Левітас, Волонец, Шымановіч, Ротапец і Сагаловіч.

Налёт белагвардзейцаў на кіраўніцтва К.-У. чыгункі у Харбіне

Дэталі налёту на кіраўніцтва К.-У. чыгункі сьведчаць аб вялікай папярэдняй падрыхтоўцы белагвардзейцаў да налёту і аб наліччы ў белагвардзейцаў опэратыўнага цэнтру і опэратыўнай організацыі, якія пагражаюць зрывам работы К.-У. чыгункі

ТОКІЁ, 29. З Харбіну паведамляюць, што 27 студзеня 600 белагвардзейцаў, зволеныя з КУ чыгункі, па папярэдняму згавору сабраліся і, узброіўшыся палкамі, уварваліся ў кіраўніцтва КУ чыгункі. Група белагвардзейцаў уламаліся ў габінэт упраўляючага чыгункі т. Рудога, наносячы на хаду пабоі службоваму пэрсоналу, які імкнуўся захаваць і падтрымаць парадак у памяшканьні. З грубымі выкрыкамі і лаянкай белагвардзейцы абкружылі тав. Рудога.

У адказ на пытаньне Рудога аб мэце іх візыту белагвардзейцы заявілі, што яны патрабуюць дапамогі ў памеры трохмесячнага акладу. Руды зазначыў, што палажэньне аб служачых КУ чыгункі не прадугледжвае падобнай дапамогі. Ва ўсякім выпадку з падобным патрабаваньнем трэба зьвярнуцца ў кіраўніцтва чыгункі. Налётчыкі ня выслухаўшы да канца Рудога, размахваючы палкамі, пачалі крычаць: **„Пачакайце, будзе другі конфлікт, тады мы вам пакажам“.**

Толькі па прыбыцьці чыгуначна-дарожнай ахраны бандыты пакінулі габінэт упраўляючага чыгункі і далучыліся да астатніх белагвардзейцаў. На мітынгу, які тут-жа быў наладжаны белагвардзейцамі, апошнія выступалі з пагромнымі прамовамі, выкрыкваючы лёзунгі: **„Прэч саветы“**, пагражалі — **„яшчэ прыдзем—гранатамі закідаем“**, падкрэсьлівалі **„на нас глядзяць замежныя дзяржавы“.**

Дэталі налёту на кіраўніцтва К У чыгункі сьведчаць аб вялікай папярэдняй падрыхтоўцы белагвардзейцаў да налёту і аб наліччы ў белагвардзейцаў опэратыўнага цэнтру і опэратыўнай організацыі, якія пагражаюць зрывам работы К.-У. чыгункі.

Усё гэта ўпаўне сьведчыць пацьвярджаму раней паведамленьню аб выданым белымі сакрэтным абежніку, які прадугледжваў ажыцьцяўленьне сэрыі шкодніцкіх актаў на К.-У. чыгунцы, па прыбыцьці на чыгунку савецкай адміністрацыі.

У Харбіне пануе трывожны настрой. Яўрэйскае насельніцтва баіцца антысэміцкіх выступленьняў. Характэрна, што паліцыя ня прыняла своечасова захадаў да папярэджаньня белагвардзейскага налёту на кіраўніцтва чыгункі і не супярэчыць далейшым зборам белых на вуліцах.

Галоўныя акторы на лёнданскай камэдыі па „марскім разброеньні“



Зьверху ўніз: Макданальд (Англія), Стымсон (ПАЗШ), Тардзье (Францыя), Гранды (Італія)

НАПЯРЭДАДНІ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

ЗЯМЛЯ ЧАКАЕ СВАІХ БУДЗЁННЫХ

МЫ ЯШЧЭ НЕ ПАКОНЧЫЛІ З ЧАРАПАШЫМІ ТЭМПАМІ

ТЭРМІНОВА ОРГАНІЗАВАЦЬ: абагуленьне насенных фондаў, зерна-ачыстку, рэмонт сельгасмашын і інвэнтару

ПАСЛАЦЬ У ВЁСКУ ЛЕПШЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ. ОРГАНІЗАВАЦЬ НОВЫЯ КАЛГАСЫ

НІЯКАИ ЛІТАСЬЦІ КУЛАЦТВУ

Рэволюцыйным тэмпам

Надыходзіць рашучая бальшавіцкая вясна.

Надыходзіць вясновая пасеўная кампанія, якая па сваёй адказнасьці, па сваіх вялічэзных задачах зьяўляецца першай такой пасяўной кампаніяй.

Усё гэта патрабуе ан нас надзвычайнага ўдзелу, дасканалай падрыхтоўкі для таго, каб удала раставіць сілу на найбольш важных вучастках клясавага фронту ў вёсцы.

Пасяўная кампанія 1930 г. будзе праходзіць пад лёзунгам суцэльнай колектывізацыі цэлых раёнаў і акруг, пад лёзунгам ліквідацыі кулацтва, як кляса.

У сувязі з гэтым клясавая барацьба будзе надзвычайна абвостранай. Гэта абавязвае нас, да асаблівай пільнасьці ў адносінах рашучага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі, накіраваных на канчатковае зьнішчэньне капіталістычных элемэнтаў у вёсцы.

Трэба пакласьці канец усялякім опортуністычным размовам аб тым, куды дзець кулака і г. д. Трэба казаць аб тым, як хутчэй узяць кулацкі інвэнтар, кулацкую маёмасць, жывёліну ў колгасы, як лепей організаваць і падрыхтаваць бядняцкія і серадняцкія масы вёскі для абагуленьня іх гаспадарак.

Трэба бязьлітасна біць па кулацтву, якое ня бачучы для сябе зараз ніякага іншага выхаду, зьнішчае сваю маемасьць, жывёліну, псуе сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Комсамольскія „лёгкія кавалеры“, комсамольскія ячэйкі ў вёсцы павінны за ўсім гэтым сачыць, павінны з гэтым змагаецца, павінны дапамагаць усімі сіламі правядзеньню колектывізацыі.

Комсамольскія організацыі зараз павінны паслаць у вёску самыя лепшыя свае сілы, самых лепшых комсамольцаў. Вёсцы трэба даць на сталую работу ў колгасах добрых, ініцыятыўных, падрыхтаваных організатараў, трактарыстых, мэханікаў, рахункаводаў.

Партыя мобілізуе згодна пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) 25 тысяч рабочых у колгасы. Нашы організацыі павінны вылучыць у гэты лік і свае кандыдатуры.

Да нас у БССР на дапамогу праводзіць веснавую пасяўную кампанію, праводзіць калектывізацыю, едуць ЛЕПШЫЯ ПРОЛЕТАРЫІ „ЧЫРВОНАГА СОРМАВА“.

Дапамога буйнага вытворчага цэнтру—БССР, у якой у мінулым дзякуючы права-опортуністычнай політыцы Наркамзему насаджаліся хутары і атрубы, якія цяпер канчаткова зьнішчаюцца,—дапамога гэта —зьяўляецца вялікім політычным фактарам.

Кожны акругком, кожны райком павінны высылаць зараз-жа ў вёску ўдарныя брыгады.

Вёску трэба забясьпечыць сельска-гаспадарчым інвэнтаром. Гарадзкія комсамольцы павінны сачыць, як сваечасова забясьпечваюцца раёны суцэльнай колектывізацыі неабходнымі сельска-гаспадарчымі машынамі.

Лёзунг—вясковы комсамолец у колгасы дзякуючы шпаркім тэмпам соцыялістычнай рэконструкцыі, трэба пашырыць. Жыцьцё патрабуе новага,— ніводнага вясковага комсамольца па-за колгасамі. Трэба ня толькі ўступіць самому, трэба быць яшчэ і організатарам бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі ў сэнсе іх колектывізацыі. Мала быць самому ў колгасе, трэба яшчэ організоўваць новыя колгасы.

Веснавая пасяўная кампанія павінна прайсьці з посьпехам. Трэба кожнаму камітэту і кожнаму комсамольцу ўсьвядоміць тыя вялікія політычныя задачы, якія ўскладаюцца на яго партыяй у гэтую рашаючую бальшавіцкую вясну.

35,1 ПРОЦ. ПАСЕЎНАЕ ПЛОШЧЫ БССР ПАД КОЛГАСАМІ

На 20-е студзеня плян па колектывізацыі сельскай гаспадаркі, які быў намечаны да вясны, ня толькі выкананы, але і перавыкананы.

Зараз у БССР налічваецца 2813 колгасаў з плошчаю зямлі ў 1772941 гэктараў і з колькасьцю гаспадарак у іх 215185.

На першым месцы па колектывізацыі ідзе Магілеўская акруга, па якой налічваецца 494 колгасы з 54,5 проц. колектывізаванай плошчы. За ёю ідзе Гомельская, па якой налічваецца 198 колгасаў з колектывізаванай плошчаы ў 219030, альбо 37,7 проц., Мазырская— 34,5 проц., Аршанская—36,6 проц.

АРМІЯ ВЫСТУПАЕ У АГРАПАХОД

Уся праца па колектывізацыі ў нашай №-скай Самарскай кавалерыйскай дывізіі праходзіць пад лёзунгамі:

„Пагалоўнае ўцягненьне чырвонаармейцаў і малодшага начскладу сялян, якія звальняюцца ў бестэрміновы водпуск восеньню 1930 г., у колгасы з мэтай падрыхтоўкі з іх актыўных колгасьнікаў“.

„Стопроцантны ўваход звальняемых сялян партыйцаў і комсамольцаў у колгас“.

Для ажыцьцяўленьня гэтай вялікай задачы зараз у дывізіі наладжваюцца курсы, якія пачнуць сваю працу ў студзені гэтага месяцу.

Курсы намячаюць падрыхтаваць 200 чалавэк організатараў колгасаў, 150 чалавек трактарыстых, 50 чалавек шофэраў і 50 жывёлаводаў.

Апроч гэтых курсаў утвараемых у маштабе дывізіі павінны быць створаны яшчэ шэраг гурткоў па падрыхтоўцы організатараў колгасьнікаў такім разьлікам, каб поўнасьцю ахапіць усіх чырвонаармейцаў і ўвесь малодшы начсклад звальняемых восеньню гэтага году.

Для забясьпечаньня гэтай работы адпушчаецца тры тысячы рублёў.

Уводзіцца спэцыяльны колгасны дзень, у які праводзяцца заняткі ўсіх гэтых гурткоў.

Але патрабуецца дапамога ў адносінах прадстаўленьня памяшканьняў для занятак, майстэрняў, для практычнай работы курсантаў.

Адначасова зараз дывізыя рыхтуецца для выступленьня ў аграпаход.

Разам з усёй гэтай работай ставіцца задача ня зьніжаць, а наадварот, як мага лепей павышаць якасьць тэмпы баявой падрыхтоўкі і ваенна-політычнай вучобы.

Гр. Шыфрын.



Лепшыя пролетарыі Сормава едуць на Беларусь

ЛІСТ ПЛЕНУМУ МАГІЛЕЎСКАГА АКРУГКОМУ ЛКСМБ—РАЁННАМУ КАМІТЭТУ І КАЛЕКТЫВУ УсеЛКСМ ЗАВОДУ „ЧЫРВОНАЕ СОРМАВА“

Дарагія таварышы!

МАГІЛЕУШЧЫНА ў мінулім акруга бязьлітаснай эксплёатацыі і абнішчаньня бядняцкіх і серадняцкіх мас сялянства, за л к якіх абагачаліся абшарнікі, капіталістыя і папы, акруга з соцыяльным і нацыянальным прыгнечаньнем працоўных мас, цяпер дзякуючы пераможнай Кастрычнікавай рэволюцыі пратвараецца ў акругу з вырастаючай прамысловасьцю, пратвараецца ў акругу савгасаў, комун і буйных колгасаў.

Пленум Магілеўскага акруговага камітэту ЛКСМБ, які сабраўся для вырашэньня шэрагу пытаньняў, зьвязаных з удзелам комсамолу ў правядзеньні суцэльнай колектывізацыі акругі ад імя 10-тысячнай арміі комсамолу Магілеўшчыны пасылае вагністае братэрскае комсамольскае вітаньне ўсім рабочым заводу „Чырвонае Сормава“ і з здавальненьнем адзначае факт прыняцьця шэфства над аднэй з частак БССР—магілеўскай акругай.

Гэты факт прыняцьця шэфства пролетарыямі „Чырвонага Сормава“ даказвае яшчэ раз тую моцную солідарнасьць усей рабочай клясы ў барацьбе за перамогу соцыялізму.

Комсомол Магілеўшчыны пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі перамагае шэраг цяжкасьцяў, зьвязаных з умовамі нашай акругі, адкідвае ад сябе соцыяльна-варожыя і выпадковыя элемэнты, выпраўляе дапушчаныя памылкі і клясавыя прарывы, якія мелі месца ў рабоце арганізацыі, мобілізуе рабочую, батрацкую, бядняцкую і серадняцкую моладзь, для актыўнага ўдзела ў соцыялістычным будаўніцтве і правядзеньні суцэльнай колектывізацыі акругі.

Пленум Магілеўскага АК ЛКСМБ, вітаючы комсамол і рабочую моладзь „Чырвонага Сормава“ ўпэўнен, што комсамолія „Чырвонага Сормава“ цесна будзе трымаць сувязь з нашай організацыяй і акажа таварыскую дапамогу нашай рабоце па соцыялістычнай перабудове вескі. Пленум упэўнен, што ў далейшым комсамол Магілеўшчыны сумесна з комсамолам „Чырвонага Сормава“ пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі будуць актыўнымі барацьбітамі ў барацьбе за соцыялізм.

Ня ай жыве саюз рабочае клясы з бядняцкімі і серадняцкімі масамі сялянства.

Няхай жыве комсамолія і рабочыя моладзь „Чырвонага Сормава“.

Няхай жыве комуністычная партыя, яе Ленінскі ЦК — правадыр, організатар і кіраўнік соцыялістычнага будаўніцтва.

Пленум Магілеўскага АК ЛКСМБ.

Машыны стаяць

Пры вучэбнай гаспадарцы Смальяны, Аршанскай акругі маюцца дзьве зернаачышчальныя машыны.

Дзьве гэтыя каштоўныя машыны ўвесь час цапер знаходзяцца недзе ў адрыне.

Гэтыя машыны павінны ачысьціць 2000 пудоў насеньня па пункту, які прызначан паводле ўмовы соцыялістычнага спаборніцтва. Але пры такой пастаноўцы работы пры такіх тэмпах наўрад ці будзе выканана гэтая лічба.

А наогул-жа па ўсяму Смальяваскаму сельсавету зернаачышчальныя машыны яшчэ зусім не пачалі працаваць.

А. Хадкевіч.

С.-г. профшкола.

У Слаўным ня усё слаўна...

Надыходзячая вясна зьяўляецца рашучай пераломнай вясной спр... колектывізацыі вёскі і падняцьця ўраджайнасьці. Трэба хутка пачаць рыхтавацца. Кожная хвіліна павінна быць на вучоце. Студзень і люты рашучыя месяцы падрыхтоўкі.

Наша Слаўнаўская ячэйка ЛКСМБ ня ўцяміла зусім гэтага важнага пытаньня. Яна яшчэ зусім ня думае аб вясеньняй сяўбе. Пытаньне вясеньняй пасяўной кампаніі яшчэ ня стала стрыжнем у штодзённай працы комсамольскай і партыйнай ячэек. Між тым ячэйка ст. Слаўнае зьяўляецца рабочай чыгуначнай ячэйкай, на яе ўскладаюцца задачы па правядзеньню ў бліжэйшых сельсаветах веснавой пасяўной кампаніі.

Райпнаму камітэту комсамолу трэба зьвярнуць увагу, трэба добра прашчупаць ячэйку, ударыць па тых абломавых, якія нічога ня робяць па гэты час.

Юнкор.

Ставім пытаньне ва ўпор

„Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы беларусізацыя зьяўляецца адным з асноўных сродкаў ажыцьцяўленьня кіруючай ролі пролетарыяту да асноўных мас сялянства“—вось што гаворыць у сваёй пастанове ЦК КП(б)Б. Безумоўна, на сёньняшні дзень мы маем вялікія посьпехі на фронце культурна нацыянальнага будаўніцтва Беларусі. Але-ж побач з дасягненьнямі нельга абыйсьці тых недахопаў, якія яшчэ ёсьць і патрабуюць тэрміновага зьнішчэньня.

Трэба адзначыць, што па некаторых прадпрыемствах праяўляецца часта сьвядомае супраціўленьне выкананьню пастаўленых партыяй і савецкай уладай задач па нацыянальнаму пытаньню.

ШТО, БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ?.. ДА КІНЬ РЫПАЦЦА!

Кнігарні ў справе беларусізацыі таксама маюць вялікае значэньне, але-ж трэба канстатаваць, што ва ўсіх кніжных крамах Менску асабліва ў аддзяленьнях (ГИЗ'у), зашоўшы туды, ніколі не заўважыце, што там людзі ўжываюць беларускую мову.

Аб коопэрацыйным апараце Менскага ЦРК трэба таксама сказаць, што ён не беларусізаваны. Ні ў аднэй краме, ні ў адным ларку, сталоўцы вы ня знойдзеце працаўніка, які-б ужываў беларускую мову і імкнуўся к таму, каб авалодаць ёю.

Перайдзем да працаўнікоў, якія таксама маюць штодзённае стыканьне з працоўнай масай—гэта працаўнікі трамваю. Сярод іх таксама не вядзецца ніякай работы і няма ніякага імкненьня да таго, каб маючыяся дырэктывы па беларусізацыі праводзіць у жыцьцё.

Мы пытаем:

Дзе партыйныя, комсамольскія ячэйкі, дзе адміністрацыя, дзе мясцкомы, завкомы, кулькамісіі, што яны па гэтаму пытаньню зрабілі?

Мы ўпэўнены, што па ўсіх гэтых установах маюцца красамоўныя рэзолюцыі, зафіксаваны ў пратаколах інформацыі аб беларусізацыі, але ўсё гэтыя прапановы і пастановы на практыцы ніяк не ажыцьцяўляюцца і кожнаму чытачу, які штодзённа сутыкаецца з працаўнікамі гэтых установ, усе падаецца відавочна.

НА ЯКОЙ МОВЕ ГАВОРАЦЬ... НА РАЗЬБЯРЭШ

Па нашых школах вельмі часта яшчэ здараецца, што вучні, студэнты, а таксама і настаўніцтва да беларусізацыі адносяцца ня з поўнай адказнасьцю.

Юнкор Лось А. (Заслаўе)—піша, што сярод настаўніцтва Сёмкава-Гарадзецкай сямігодкі ў справе беларусізацыі ёсьць многа недахопаў. Сам загадчык школай гаворыць па-расійску. А некаторае настаўніцтва вядзе гутарку на зусім незразумелай мове. Слухаючы, ніяк не разьбярэш,—гаворыць ён па-беларуску, ці па расійску.

Юнкор „Матла“ з Мсьслаўскага БПТ, юнкор „Кавалерыст“ з Гомельскага тэхнікуму шляхоў зносін і юнкор „Вучань“ з 1-ай Менскай сямігодкі пі... шуць, што студэнты і вучні супраціў... ляюцца вывучэньню беларускай мовы. Напрыклад, з Тэхнікуму шляхоў зно... сін кажуць; „На что нам белоруссизация, если мы по окончании едем ... РСФСР“.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што на нашых чыгунках сярод рабочых ... служачых з беларусізацыяй справа стаіць нярухома. З боку належны... організацый чыгунак няма яшчэ та... штодзённага штуршка, які-б прыму... шаў кожнага праваднікa вагона, стр... лачні а, скарбніка і іншых штодзённа... ў сваёй рабоце ўжываць беларуску... мову.

Трэба сказаць, што на заводах ... фабрыках работа па беларусізацыі рабо... чых пастаўлена яшчэ слаба.

Наш судовы апарат перавёў ус... свае справы на беларускую мову, але-ж грамадзкія абаронцы ў сваіх высту... пленьнях на судзе часта ня ўжыв... беларускае мовы. Напрыклад юнкор „М. Ш.“ з Стара-Даросчага р-ну піша, што „Праваабаронца Скварцоў заўсёды на судзе выступае на расійскай мове і не клапоціцца аб тым, каб у сваіх выступленьнях ужываюць беларускую мову“.

Трохмесячнік беларускай і нацыянальнай культуры павінен значна штурхнуць наперад справу беларусізацыі з тым, каб усю нашу работу па беларусізацыі ўвязаць з тэмпамі разгортваньня соцыялістычнага будаўніцтва.

Я. К.

НА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ

ТРЫВОЖНЫЯ ВЕСТКІ

Месячнік лесазагатовак пачаўся. Аддамо яму максімум увагі

Кулакоў, якія ўхіляюцца ад гужавой павіннасьці,--да судовай адказнасьці

(З пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР)

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў проэкт пастановы ЦВК і СНК БССР аб пашырэньні праў мясцовых саветаў у галіне дапамогі выкананьню пляну вывазкі дроў і лесаматар'ялаў.

Згодна гэтай пастановы, сельскім саветам дазволена, у тых выпадках, калі кулацкія гаспадаркі будуць ухіляцца ад гужавой павіннасьці па вывазцы дроў і лесаматар'ялаў, накладаць на іх штраф у адміністрацыйным парадку да 100 рублёў. У выпадках організаванага па ўзаемнай згодзе адмаўленьня або ўхіленьня кулацкіх гаспадарак ад выкананьня гужавой павіннасьці, сельскія саветы абавязаны перадаваць справы аб іх у суд для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці паводле арт. 95 К, К. БССР.

„Я ЗАЙМАЮ ПАСАДУ"...

16-га студзеня адбыўся сход Бабаўскай ячэйкі КСМ. Разьбіралася пытаньне аб пасылцы брыгады з 3 чалавек на лесазагатоўкі. Зачыталі сьпіс вылучаных на бюро. Адразу-ж ва ўсё пачалі выказвацца вылучаныя. Тав. Краўчынскі заявіў:

— „Я не магу, я шавец. Бюро якое зусім кепска падышло з боку сацыяльнага становішча, да таго-ж я не змагу прахарчаваць матку і дзяцей, якія знаходзяцца на маім утрыманьні". Другім выступіў Бандароў Хвёдар, які адзначыў, што ён мае пасаду і ў лес ня пойдзе. Чальцы пачалі змазваць гэтае пытаньне, пачалі вылучаць другіх таварышоў.

Маленькі факт, але кажа за тое, што комсамольцы гэтай ячэйкі накепсацельскі аднесьліся да лесанарыхтовак.

Акунёў Ст.

УДАРНАЯ БРЫГАДА

Сёньненская комсамольская організацыя (Віцебшчына) вылучыла ўдарную брыгаду з 32 асоб, якая на другі дзень накіравалася па раёну з мэтай таго, каб завастрыць пытаньне на сходах вясковых ячэек аб лесазагатоўках. Трэба чакаць, што ўдарная брыгада паслужыць штурхачом у працы вясковых ячэек.

Гарадзкія організацыі вынесьлі пастанову аа мобілізацыі комсамольцаў на сталую працу. Мобілізацыя прашла наступным парадкам: гарсавецкая ячэйка накіравала 8 чал., працзямлесаўская—10 і сельская—7.

Паташоў Х.
Жыцельзейф З.

Губяць лес

У вёсцы Сінягаве (Бабруйшчына), у час рэлігійнага сьвята п'яных калядз, у лясох мясцовага значэньня шмат вырубілі лесу. Палясоўшчык Турэц Антось разам з сваім братам паказалі першы „прыклад". Трэба ўпаўнаважаному лясоў мясцовага значэньня ў хуткім часе зрабіць рэвізыю.

Алесь Сіротка.

ЧЫЁ ГЭТА ГАЛАВАЦЯПСТВА?

Бягомльскі РК КСМ разаслаў ячэйкам лісты, каб вылучаныя для лесараспрацовак таварышы зьявіліся на 13-І—30 г. у райком. У лістох пісалася, што калі ў комсамольцаў ня будзе сякер і піл, дык гэтыя прылады будуць давацца на месцы, а таксама будзе давацца і спэцвопратка. Прышоўшых у райком комсамольцаў накіравалі у Асавы (вёска, якая знаходзіцца ад Бягомельскага РК КСМ за 15 кілёмэтраў). На месцы знашлі яны малодшага дзесятніка, які аб прыходзе комсамольцаў нічога ня ведаў. Дзесятнік хутка паехаў, а камсамольцы засталіся бяз усякага кіраўніцтва. Як відаць, дагаворанасьці з боку РК ніякай ня было. Прышлося нашым комсамольцам зноў накіравацца ў райком. Такія адносіны з боку райкому і лесазагатавіцеляў зрываюць працу ўдарных брыгад на лесараспрацоўках

Комсамолец.

БЮРАКРАТАРСКІ „ПРЫКЛАД"

На запатрабаваньне з Воршы аб мобілізацыі комсамольцаў на лесараспрацоўкі ў ліку 100 чалавек адгукнуліся толькі 50. Прыехаўшы на месца працы і адпачыўшы дзень, вышлі на працу, загадзя разьбіўшыся на дзьве групы. Месца працы ад вёскі знаходзіцца на адлегласьці 3-х вёрст. Інструмант дрэнны. Ня гледзячы на гэта, другая група паказала сябе па-комсамольску. У склад яе ўваходзілі лепшыя рабочыя. У свой час працавалі добра. Звалілі столькі дрэў, што нават мясцовыя сяляне дзівіліся. Зусім іншае мы бачым у першай групе. Праз кароткі час пасьля прыезду ўсе, як адзін, уцяклі. Першым уцёк, паказаўшы „прыклад" — сакратар Ерухімовіч.

Г. М.

Дзяўчаты на лесараспрацоўках

У Гарачыцкай ячэйцы (Мазыршчына) выказалі згоду паехаць на лесазагатоўкі дзяўчаты. Зусім інакш робіцца ў ячэйках Даманавіцкай, Слабодзкай, Капліцкай, Шыіцкай і Аўюкоўскай. Сябры Даманавіцкай ячэйкі, каб увільнуць ад лесазагатовак, шукаюць розных выхадаў. Комсамолец Гарэлік Мэер пашоў да доктара і ўзяў спраўку аб тым, што ён непрацаздольны (затое працаздольны па суботах час праводзіць на пагулянках). Часта яшчэ можна чуць такія заявы, што няма абутку, трэба купляць, або хай даюць у крэдыт.

Гэтым зрываюць усю працу.

Я. Акуліч.

Комсамол уперадзе

У вёсцы Вялікі-Бор (Магілеўшчына) трэба вазіць лес на станцыю. Дарога дрэнная і ніхто вазіць лесу ня хацеў, а чакаў пакуль не набавяць цану за правоз. Комсамольская ячэйка ўзьняла пытаньне. Ухвалілі выехаць ўсёй вёскай і вазіць цэлы тыдзень. Грошы выдаць пасьля сканчэньня возкі. Возка пачалася. Вывезьлі амаль што дзесяціну.

КАВАЛЁЎ АЛЕСЬ.

ДОБРЫ ПРЫКЛАД

Комсамольская ячэйка вёскі Ламачы, Азарыцкага раёну, Мазырскай акругі з'організавала на першы дзень каляд ўсю вясковую моладзь, а таксама і моладзь суседніх вёсак, і выехала ў лес рэзаць дровы. Гэткаму прыкладу пасьледвалі сяляне,—выехалі на новы год у хрышчэньне ў лес вазіць дровы.

Цфасман.

Яшчэ не абгаворана

Слаўнаўскай ячэйкай КСМ Аршанскай акругі на сходзе не абгаварвалася пытаньне аб лесазагатоўках. Даручэньне РК ЛКСМБ аб пасылцы 13 чалавек з Слаўнаўскай ячэйкі яшчэ не абгаворана і ня прыступлена да яго выкананьня.

Юнкор.

НІ КРОКУ НАЗАД АД КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ!

БАРАЦЬБА ЗА ПРОМФІНПЛЯН--БАРАЦЬБА ЗА СОЦЫЯЛІЗМ

УСЕ СІЛЫ, УСЕ СРОДКІ, УСЁ ЎМЕНЬНЕ--НА ВЫКАНАНЬНЕ ВЫТВОРЧАЙ ПРОГРАМЫ!

...„ЦК лічыць, што барацьба за зьніжэньне сабекошту, за выкананьне вытворчай праграмы і палепшаньне якасьці продукцыі павінны стаць у цэнтры ўвагі ўсіх організацый рабочае клясы..."

(З адозвы ЦК УсеКП(б)

Заводы Мэталятрэсту ня выканалі плянаў

За 1-ы квартал бягучага гаспадарчага году промфінплян па ўсіх прадпрыемствах Белмэталятрэсту ня выкананы на 15 проц. Трэст тлумачыць гэта недастатковай дастаўкай сыравіны, слабым разгорнутым соцыялістычным спаборніцтвам і іншымі прычынамі. Зьніжэньне сабекошту промфінплянам прадугледжавалася на 14,7 проц., выканана-ж толькі на 6,46 проц.

З агульнай колькасьці 7 заводаў Мэталятрэсту промфінплян ня выканалі: „Чырвоны Адраджэнец" (Магілёў) на 37 проц., „Чырвоны мэталіст" (Віцебск) на 21,2 проц., „Пролетары" (Гомель)—на 16 проц. „Энэргія" (Менск) на 22 проц. Па аднаму толькі вырабу сельска-гаспадарчых машын заданьне недавыканалі на 40 проц., г. зн. ня выпушчана 21 тысяча плугоў. Трэст і самі заводы не зьвярнулі належнай увагі на падрыхтоўку рабочай сілы; ня зусім здавальняюча было пастаўлена забясьпечаньне заводаў сыравінай, гэтыя і шэраг іншых прычын былі падставай невыкананьня промфінпляну.

„ЭНЭРГІЯ"—У ХВАСЬЦЕ

Найбольш яскравы прыклад невыкананьня промфінпляну дае Менскі завод „Энэргія". Ён плянавыя заданьні недавыканаў на 22 проц. Павялічыўся брак.

У ліцейным цэху з 5,1 проц. у апошнім квартале 28-29 году, брак падняўся да 6,6 проц. у першым квартале бягучага году.

Галоўная прычына хаваецца ў адсутнасьці кваліфікаванай рабочай сілы, конкрэтна—у недахваце фармоўшчыкаў. Часам гэтую работу даручалі чорна-рабочым. Ненармальнае становішча і са зьніжэньнем сабекошту. За кастрычнік месяц 29 г. сабекошт даў павялічэньне на 1,2 проц. Плянавыя заданьні па вытворчасьці працы выкананы з 22 проц. да 12 проц —гэта значыць нявыканана палова заданьня нават ударны цэх па зборцы ваг недавыканаў плян на 15 проц.

Партыйная і комсамольская організацыі заводу мала-што зрабілі ў гэтым напрамку. Ніякай рацыяналізатарскай работы у цэхох не праводзіцца, вылучаныя рацыяналізатары нічога ня робяць

Толькі два заводы: „Комунар" і „Рухавік Рэволюцыі" выканалі промфінплян на 90 проц. Гаворачы аб „Комунары", трэба адзначыць, што завод ня зусім добра абсталяван, значна горш чым „Энэргія" і посьпехі, якія мае „Комунар" на фронце выкананьня промфінпляну, тлумачацца выключна адданасьцю саміх рабочых і гаспадарчай пастаноўкай работы.

Ня гледзячы на гэта, Белмэталятрэст не зьвяртае належнай увагі на будаўніцтва заводу. Характэрны факт,—вытворчая камісія разам з заводакіраўніцтвам выпрацавала плян увозу замежнага абсталяваньня на суму 93 т. руб. З меркаваньнямі спачатку згадзіўся трэст, згадзіўся і ВСНГБ. Але раптам трэст адумаўся і скасаваў крэдыт на абсталяваньне. Было і так, што Белмэталятрэст абяцаў на абсталяваньне новай кузьні адпусьціць 200 тысяч руб., але гэта ня выканана і па сёньняшні дзень.

А ЦП СЛАЎ ДЫРЭКТЫВЫ...

ЦП саюзу мэталістых рассылала дырэктывы і рэзолюцыі, констатавала недахопы, адзначала посьпехі заводаў. Працаўнікі саюзу на прадпрыемствы не зьяўляюцца; старшыню ЦП т. Іванова, рабочыя нават ня ведаюць, як ня ведае тав. Іваноў, што робіцца на заводзе. Так, ён гаворыць, што вытворчая конфэрэнцыя на „Комунары" адбылася, у той час калі яна толькі рыхтуецца.

Прадстаўнік моладзі ЦП таксама меркаваў склікаць конфэрэнцыю рабочай моладзі мэталістых, але па сёньняшні дзень конфэрэнцыя не адбылася. Няма кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі. Тое самае можна сказаць і адносна нізавых організацый саюзу—завкомаў.

Рост ударных брыгад і ахоп імі рабочых па Мэталятрэсту трэба лічыць нездавальняючым. Падамо некалькі прыкладаў. На заводзе „Комунар" з 600 рабочых ва ўдарных брыгадах—135, або 24 проц. усяго ліку рабочых. На заводзе „Чырвоны Кастрычнік" (пасёлак Барань, Аршаншчына) ударніцтвам ахоплена ўсяго 12 проц. рабочых і г. д. Таму прыняцьце рашучых захадаў да разгортваньня ўдарнага руху зьяўляецца неадкладнай задачай дня. Пачатак ужо зроблен. Гэтымі днямі склікаецца завадзкая конфэрэнцыя „Комунара" і „Энэргіі", дзе будзе абвешчаны конкурс на лепшую брыгаду ўдарнікаў і лепшага майстра цэху.

Патрэбен рашучы пералом, які-б забясьпечыў выкананьне промфінпляну ў другім квартале. Трэба дабіцца самай шырокай і сваечасовай інформацыі ўсіх рабочых аб выкананьні плянавых заданьняў, з тым, каб кожны цэх, кожная брыгада і кожны паасобку рабочы ведаў усе абавязкі, якія на яго ўскладаюцца па выкананьню промфінпляну. Бяз гэтага немагчыма будзе навярстаць упушчанага.

Пашырыць колькасьць ударных брыгад, уцягнуць у соцыялістычнае спаборніцтва інжынэрна-тэхнічныя сілы, наладзіць бесьперабойнае забясьпечаньне заводаў матар'яламі, палепшыць кіраўніцтва заводамі з боку трэсту і профорганізацый. Вось пералік тых мерапрыемстваў, без якіх немагчымы далейшыя посьпехі.

Артур Ляхавецкі.



Рабочым шчаціннай фабрыкі (Менск) таварышом Чэрчэсу і Рузаву ў сувязі з перавядзеньнем на другую працу, быў зьніжаны разрад. Выданы ім двухтыднёвы сярэдні заробак у суме 160 рублёў яны перадалі ў фонд індустрыялізацыі.

На здымку Чэрчэс і Рузаў.

Беларускі нацфашызм--агэнт польскага імпэрыялізму

(Працяг. Пачатак гл. у №№ 20, 21 і 23)

БЕЛАРУСКІ НАЦФАШЫЗМ ЗРАСТАЕЦЦА З ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРАЙ

Працоўныя масы і працоўная моладзь асабліва добра памятае, што як толькі фашысты Пілсудзкі зрабіў уступкі беларускай буржуазіі і кулацтву за кошт яшчэ большай эксплёатацыі, нацыянальнага прыгнечаньня, галечы і голаду працоўных мас Заходняй Беларусі, усё гэта было зроблена для зьдзейсьненьня сваёй мэты—вайны супроць СССР, а з другога боку, калі моцна ўдарыла няпрымірная пролетарская рука — КП(б)Б па опортунізму і розным колерам нацыянал-дэмократызму, дык яшчэ шпарчэй загула праца па выкананьню соцыялістычнага пляну індустрыялізацыі Савецкай Беларусі, колектывізацыі сельскай гаспадаркі і разьвіцьця беларускай пролетарскай культуры, дык усе спадарожнікі Луцкевічы, зараз-жа прымкнулі да фашысцкага лягеру. Луцкевіч, Астроўскі і К-о, згаварыўшыся з вядомым правакатарам Гурыным і разам з польскай дэфэнзывай пачалі душыць уздым рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху і фізычна зьнішчаць комуністычную партыю і КСМ. Яны хацелі стаць на яго чале, каб скаваць яго фашысцкімі путамі. У выніку іх правакатарскай дапамогі ў астрогах гніюць сапраўдныя барацьбіты і прадстаўнікі нацыянальна-вызваленчага руху Тарашкевіч, Мятла, Валошын, Рак-Міхайлоўскі і тысяч іншых барацьбітоў, імёны якіх невядомы.

Разам гніюць у фашысцкіх казэматах тысячы лепшых юнакоў-барацьбітоў, а яшчэ больш іх фізычна пакалечана.

Працоўнай моладзі Заходняй Беларусі памятны яшчэ незастыўшыя раны першых атак на яе нацыянал-фашыстых Астроўскіх і Луцкевічаў як у беларускіх гімназіях, у таварыствах беларускай школы, так і ў іншых організацыях нацыянальна-вызваленчага руху.

На ўсе спробы фашызацыі ТБШ, фашызацыі вучнёўскай моладзі беларускіх гімназій, верныя служакі польскага фашызму Луцкевіч і Астроўскі па закліку компартыі і КСМ атрымалі рашучы адпор з боку рабочых і сялян і працоўнай моладзі.

Даведаўшыся аб спэкуляцыі популярным імем Беларускай Сялянскай Работніцкай Грамады, аб спробах Луцкевіча перацягнуць у лягер фашызму паслоў БСРГ, якія сядзяць у астрогах, апошнія з-за моцных астрожных муроў таксама далі рашучы адпор гэтай правакацыі.

РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ ПРАЦОЎНЫХ МАС НЕ ЗЛАМАЦЬ

Ні хітрыя правакатарскія манэўры, ні іх хлусьлівыя прыкрыцьці „левай" фразай за Беларуска-Сялянскую Работніцкую Грамаду, не адкрыты данос сваёй газэты „Наперад" у дэфэнзыву на сапраўдных пераемнікаў Грамады, на беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клюб і нацыянальна-вызваленчай організацыі рабочых, працоўнага сялянства—не адурманяць працоўныя масы і ня зломяць іх рэволюцыйнай барацьбы.

Зараз добра выпрабаваная луцкевічаўская зброя шовінізму, правакацыі, контр-рэволюцыі і фашызму ў поўным хаду.

Нацыянал-фашыстыя з пенай на вуснах брэшуць на БССР, на компартыю савецкай Беларусі, на Комінтэрн, на нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі і КПЗБ. Яны заклікаюць працоўныя масы на барацьбу з інтэрнацыяналістамі, якіх называюць сапраўднымі пераемнікамі Беларуска-Сялянскай Работніцкай Грамады, супроць КПЗБ, якая вядзе масы на барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, а таксама і КСМ—заклікае масы заняцца мірнай органічнай працай з фашызмам, „ад якога атрымаеце ўсё, толькі арганізуйцеся і ідзеце за намі".

> ...„Ад сёнешняга дню, ад гэтай гадзіны трэба ўсе беларускія радыкальныя сілы мобілізаваць на грунце позытыўнае творчае культурна-нацыянальнае працы. Без такой працы няма беларускага руху"... („Наперад" № 1).

Каб спыніць рэволюцыйны пыл працоўных Луцкевіч паказвае фашысцкай дыктатуры, як спусьціць яго ў фашысцкія корбы—гэта адкрыць пару беларускіх школ пад яго апекай.

> ...„бо-ж імкненьне беларускага народу (бачыце, усяго народу—П. С.) мець сваю родную школу ўжо столькі вялікае, што „гэтае народнае хвалі ня спыніць, ня ўстрымаць" (апошнія словы ўзяты з прамовы Тарашкевіча 1927 году)... бо гэта будзе не залішне"...

П. С—кі.

(Канец будзе)

Прывітаньне „Чырвонай Зьмене“

ЗАВЕТЫ ЛЕНІНА ВЫКАНАЕМ

Мы, колгасьнікі ў ліку 84 гаспадарак бüўшай вёскі Старына Горзуноўскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну ў дні 6-й гадавіны сьмерці У. І. Леніна шлем сваё шчырае прывітаньне газэце ЦК ЛКСМБ—„Чырвоная Зьмена“.

Мы колгасьнікі абяцаем выконваць заветы Леніна і ўсе свае сілы прыкласьці на справу пабудовы соцыялізму ў нашай краіне.

Маем надзею, што газэта „Чырвоная Зьмена“ ня будзе забываць нашага колгасу і дапаможа яму ў працы ў часе веснавой кампаніі, а таксама ў правядзеньні іншых політычна-важных кампаній.

Няхай жыве ленінская партыя—кіраўнік соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Няхай жыве ленінскі комуністычны саюз моладзі Беларусі!

Прэзыдыум.

Адсьвяткавалі юбілей бяз удзелу рабочых

Пазаўчора БДВ наладзіла ўрачысты вечар з прычыны свайго 5-гадовага юбілею. БДВ за 5 год свайго існаваньня мае шмат дасягненьняў, якія трэба аднесьці за кошт рабочых друкарні і іншых установ пры БДВ.

Сьвята павінна было падагуліць зробленую за гэты час працу і вызначыць конкрэтныя прапановы і мерапрыёмствы на далейшы час. Зразумела, што бяз удзелу шырокіх мас рабочых, шырокай грамадзкасьці гэтага зрабіць нельга. Вось як раз гэтага і ня ўлічылі кіраўнікі БДВ, наладжваючы вечар падсумаваньня вынікаў 5-гадовай працы Выдавецтва.

Абураючы факт: Ні парт. колектыў, ні фабзавком друкарні БДВ, ні рабочыя ня былі ўцягнуты ў падрыхтоўку да сьвята. А ўся гэта праца праводзілася двума працаўнікамі БДВ. Рабочыя нічога ня ведалі аб 5-годзьдзі, нават білеты атрымалі па скончэньні працы, ды і то на галёрку(!!)

Яшчэ неабходна адзначыць наступны факт яўнага галавацяпства і безгаспадарнасьці. На вечар патрэбны былі білеты,—робяць заказ друкарні. Форма білета некалькі раз перараблялася—яна, бачыце, не спадабалася працаўніком БДВ. На гэтую перапрацоўку патрачана 3 дні, выканаць-жа яе можна было за 3 гадзіны.

Вечар, можна сказаць, быў правален,—у ім ня ўдзельнічала маса рабочых. За гэта павінны панесьці належныя пакараньні бюрократы БДВ, якія не палічылі патрэбным, у працу па падрыхтоўцы да такога важнага юбілею як 5-годзьдзе БДВ, прыцягнуць самых рабочых.

А.


ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

ПАРАДАК СХОДУ

Гэты білет рабілі тры дні

Пастанова

Калегіі НК РСІ БССР

1) З 1-га лютага па 1-е сакавіка 1930 г. правесьці месячнік грамадзка-масавага агляду становішча рацыяналізатарскай работы ва ўсіх сав. установах БССР.

2) Асноўнай мэтай месячніку павінна зьявіцца праверка выкананьня пастаноў XVI партконфэрэнцыі аб сьмелым і рашучым спрашчэньні дзяржапарату і прыстасаваньня яго да патрэб рэканструкцыйнага пэрыоду. Агляд павінен устанавіць сапраўднае становішча рацыяналізатарскай работы ва ўстановах і выявіць ролю адміністрацыі, мясцкомаў і парт'ячэек у гэтым напрамку.

3) Праверка і агляд павінны быць арганізаваны ў асноўным сіламі саміх служачых установы і рабочымі брыгадамі з шэфствуючага над установай прадпрыёмства.

Агляд павінен быць праведзен пры максымальна актыўным удзеле саюзу Савгандльслужачых, усёй масы працаўнікоў установы і ўсёй прафэсыйна - партыйнай грамадзкасьці.

4) Даручыць усім акруговым КК РСІ тэрмінова прыступіць да арганізацыі падрыхтоўчай работы па агляду.

5) Вынікі агляду заслухаць на Калегіі НК-РСІ БССР і ўнесьці ў СНК БССР.

Нарком РСІ БССР **Калнін.**

КУЛАЦКАЯ ПОМСТА

Спалены будынкі комсамольца Грынюка

Уноч з 23 на 24 студзеня ў в. Малае Быхава, Ісарнскага сельсавету (Бабруйшчына) кулакі спалілі будынкі актыўнага колгасьніка — комсамольца ГРЫНЮКА ХВЯДОСА.

Падпал быў зроблен ў той час, як на вёсцы праходзіў сход беднаты.

На месца здарэньня выехалі сьледчы прадстаўнікі ДПУ і райвыканкому.

Ня было кіраўніцтва, брыгада развалілася

На менскім заводзе „Комунар“ месяцы два таму назад была арганізавана ўдарная брыгада маладых такароў. К гэтаму часу быў заключаны новы дагавор, які павялічыў нормы, што і паслужыла прычынай развалу гэтай брыгады.

Зразумела, брыгада не развалілася-б, каб з боку завадзкіх арганізацый было належнае кіраўніцтва. **Гэтага як-раз і ня было.** Зараз ізноў організавалася новая брыгада.

Трэба больш кіраваць работай ударных брыгад, больш дапамагаць у рабоце, тады яны ня будуць разваливацца, а будуць павялічваць колькасна і палепшаць сваю работу.

Ударнік Дрэйцэр.

ЧЫНОЎНІК ХАРУК...

Ячэйка ЛКСМБ Сёмкаўскай сямігодкі і ўсе вучні выпісалі „Чырвоную Зьмену“, але-ж газэта атрымоўваецца не акуратна. Калі адзін вучань зашоў у паштовае аддзяленьне спытаць чаму неакуратна прыходзяць газэты, дык Харук, які адказвае за гэту справу, аднёсься па-чыноўніцку і заявіў:

„Я не абязан за тваёй газэтай сачыць і насіць табе ў шафу“...

Харук выгнаў гэтага вучня з паштовага аддзяленьня. Трэба такіх працаўнікоў прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Гучок.

ПЛЕШЧАНІЦЫ--„ВЫКОНВАЮЦЬ“!

Заключаная ўмова соцыялістычнага спаборніцтва паміж Плешчаніцкім і Бягомльскім райкомамі комсамолу **з боку Плешчаніцкага РК выконваецца слаба.**


Райком ні разу не займаўся праверкай і ходам павялічэньня падпісчыкаў—комсамольцаў і прасоўваньнем у беспартыйныя гушчы працоўнай вясковай моладзі „Чырвонай Зьмены“. Наогул-жа ўважліва аднесьліся да гэтага пытаньня толькі ў час заключэньня ўмоў, а зараз усе прыціхлі. **Сьпяць ячэйкі, а з імі райком.**

Чачотка.

м. Плешчаніцы, Меншчына.

НЕ ЗАБУДЗЬ выпісаць газэту „Чырвоную Зьмену“

З фото-апарата па Мен



Скончана пабудова трамвайнага парку ў Менску.
На здымку: надворны від парку.

Шахматы і шашкі

Дэбют Бэрда

Гуляна ў вёсцы Людзіневічы (ст. Жыткавічы Мазырскай акругі)

М. Гольцман (Белыя)	Галубіцкі (Чорныя)
1. f2-f4	d7-d5
2. e2-e3	Kg8-f6
3. Kg1-f3	Kb8-c6
4. Cf1-b5!	e7-e6
5. b2-b3	Cf8-d6
6. 0—0	0—0
7. Cc1-b2	a7-a6
8. Cb5:c6+	b7:e6
9. d2-d3	Kf6-g4
10 Kb1-d2	Kf6-g4?

Непатрэбны ход, на які лепей усяго адказаць 11. Фе-2. Замест гэтага белыя праводзяць цікавую, але неправідловую атаку з ахвярамі.

11. Kf3-g5!?	Kg4:e3
12. Фd1h-5	h7-h6
13. Лf1-f3	d5-d4
14. Лf3:e3	d4:e3
15. Kd2-e4	Cь-b7

Памылковы ход. Гульня 15. c:f4, чорныя выігрываюць.

16. Ke4-f6+!	Kpg8-h8

Біць каня нельга з-за Ф:h6 з прычыны няўхільнасьці мату.

17. Kf6-e8!	падаўся

Белыя правялі ўсю партыю вельмі энэргічна.

ШАХМАТНАЯ ХРОНІКА

Менск. Прэзыдыум ВСФКБ пастанавіў распусьціць Цэнтральную шах-шаш. сэкцыю савету за бязьдзейнасьць. Новы склад сэкцыі будзе зацьверджаны на чарговым пасяджаньні прэзыдыуму ФСФКБ.

У клюбе Асьветы пачаўся шахматны турнір пры ўдзеле каля 30 гульцоў. 20 га студзеня для асьветнікаў тав. Мазэль даў сэанс адначасовай гульні ў шахматы з вынікам:+28—1.

Пачаліся шахматна-шашачныя спаборніцтва аб'яднанага мясккому хэмікаў, сумесна з сатаварыскай часткай войск ОГПУ. Прымаюць удзел 15 раб. хэмікаў і 12 чырвонаармейцаў. 26-га студзеня для ўдзельнікаў турніру тав. Мазэль даў сэанс з вынікам:+8—2 (чырвонаармейцам—Нікалаеву і Князеву)=1.

Барысаў. Скончыўся шашачны турнір 1-ай сямігодкі. У мужчынскай групе 1-ае месца заняў тав. Бенянсон. У жаночым заняла тав. Мазо.

Мы лічым немэтазгодным дзяленьне пізавых турніраў на мужчынскія і жаночыя групы. Гэткае дзяленьне мэтазгодна ў турнірах большага маштабу, дзе пакуль яшчэ наглядаецца рэзкая розьніца паміж якасьцю гульні мацнейшых мужчын і жанчын.

Ворша. Скончыўся шаш. чэмп горада, у якім удзельнічала 21 г. На 1-ае месца вышаў М. Ра (сель.-гас. рабочых), на 2-ое—Р блюм (ФЗУ МББ чыгункі).

15-га сьнежня, у рабочым па ным клюбе. тав. Розэмблюм даў адначасовай гульні ў шашкі. З партый малады сэансёр выігр 4 праіграў і 1 скончылася грышам.

АДКАЗЫ ШАХМАТЫСТ

Р. Р. (Ворша) — Дасланая „першая“ задача ўзята вамі з амэрыканскага композытара Л друкавалася яна ў апошні раз у „сомольской Правде“ ад 5-га студ Выказваем жаль, што на шлях гіяту стаў шахматысты з прац моладзі.

І. Б.—(Барысаў)—Часткова зь цім. Н. Р. (Горкі) — Задачы вы стаем.

А. Д. (Дуброўны) — 1-ю з зьмесьцім. Другая ня цікавая і н номічная. Пры складаньні шаш задачы трэба імкнуцца, каб у ка ковым становішчы не застав шашкі, непатрэбныя дзеля зачыне

А. Р. (Барысаў)—Становішча чы ненатуральна, бо чорны сло можа знаходзіцца на „h 8“ пры най пешцы „g 7“. Двуххадоўкі і хадоўкі ня могуць пачынацца ш

ПАПРАЎКІ

У № 22 „Чырвонай Зьмены“ з выступленьня тав. Шэлег з „Эль павінна быць „ВЫСТУПЛЕНЬНЕ т. МАНА“.

У № 23 на старонцы першай метцы „Брыгада—Комуна“ замест „у залежнасьці ад разрадаў“ па быць „ЎНЕ ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД РА ДАЎ“.

На 3-й старонцы гэтага-ж нум цытаце тав. Сталіна замест „ра проблемы соцыялістычнага буд тва“, павінна быць „РАШАЮЧАЙ П ЛЕМЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУ НІЦТВА“.

Камсамольск Календа

— У суботу 1-II-30 г. роўна з гадз. увечары, у памяшканьні ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне К ЛКСМБ. Яўка сяброў камісіі аб кова.

АК ЛКС

Нам патрэбны пролетарскія кадры мастакоў

АДКРЫТЫ ЛІСТ ДА НАРКАМАСЬВЕТЫ

Акадэмконфэрэнцыя беларускага Дзяржаўнага Мастацкага Тэхнікуму (Віцебск) пастанавіла давесьці да ведама Наркамасьветы аб тым, што мастацкі тэхнікум апынуўся ў зусім дрэнным становішчы з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва з боку Наркамасьветы і незацікаўленасьці працай тэхнікуму ў справе падрыхтоўкі кадраў выяўленчага мастацтва. Аб гэтым сьведчаць наступныя моманты.

Наркамасьветы да гэтага часу ня вызначыў колькасьці патрэбных Беларусі спэцыялістых мастакоў.

Наркамасьветы не зрабіў ніякіх крокаў, каб увесьці бесьперапынную вытворчую практыку ў тэхнікуме з прычыны чаго мастацкі тэхнікум ня мае магчымасьці зьвязацца з вытворчасьцю і выканаць пастанову ліпеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

На запатрабаваньні адміністрацыі тэхнікуму аб бесьперапыннай практыцы Наркамасьветы прапанаваў практыку замяніць экскурсіяй (адносіна НКА ад 4-IX—29 году, 182-34). Гэта сьведчыць аб лёгкіх, бюрократычных адносінах НКА да сталай падрыхтоўкі спэцыялістых.

Тэхнікум да гэтага часу ня мае выкладчыкаў па шмат якіх дысцыплінах (пэдагогіка, псыхолёгія, кераміка, мастацтва) на працягу паловы навучальнага году на IV курсе. Навучальная програма тэхнікуму сарвана, а разам з гэтым зрываецца і мэтавая ўстаноўка тэхнікуму, бо нельга рыхтаваць выкладчыкаў графічнага мастацтва без вывучэньня спэцыяльных пэдагогічных дысцыплін.

Керамічны аддзел тэхнікуму ня мае абсталяванай лябораторыі і тэхнічнага абсталяваньня, а таксама і клясаў (у адным пакоі працуюць IV курсы). Гэткае становішча дрэнна адбіваецца на якасьці выпушчаемых тэхнікумам спэцыялістых керамічнай вытворчасьці.

Два гады стаяць машыны ў тэхнікуме невыкарыстанымі з прычыны адсутнасьці сродкаў на іх устаноўку.

Усё адзначанае і шмат іншых фактаў, як пасылка керамікаў для адбыцьця практык на цагельны завод (зусім не па спэцыяльнасьці), несвоечасовае прызначэньне выпускнікоў мінулага году на пасады і інш., сьведчаць аб тым, што Наркамасьветы не зварочвае належнай увагі на ўмовы працы ў мастацкім тэхнікуме.

Акадэм. конфэрэнцыя зьвяртаецца да Наркамасьветы з наступнымі запатрабаваньнямі.

1. Увесьці ў тэхнікум бесьперапынную вытворчую практыку, як для керамічнага аддзяленьня на адпаведных прадпрыемствах, так і для пэдагагічнага аддзелу ў сямігодках.

2. Хутчэй падабраць выкладчыкаў па дысцыплінах: пэдагогікі, псыхолёгіі і інструктара керамікі.

3. Высьветліць колькасную патрэбнасьць Беларусі ў выкладчыках графічнага мастацтва, спэцыялістых керамічнай вытворчасьці і працаўнікоў выяўленчага мастацтва.

4. Правесьці перакваліфікацыю часткі выкладчыкаў графічнага мастацтва разам з гэтым зрабіць ачыстку навучальных установ ад няпрыгодных, нямаючых спэцыяльнай падрыхтоўкі, выпадкова пашоўшых на гэтую працу, замяніўшы іх новымі сіламі за кошт выпускнікоў мастацкага пэдагогічнага аддзелу тэхнікуму.

Прэзыдыум конфэрэнцыі.

Адказны рэдактар Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599.